# НЯМЕЦКАЯ ПРАПАГАНДА НА БЕЛАРУСІ Ў 1941–1944 ГГ.

*Вароніна Я.О., Кохан А.І лячэбны факультэт*

***Навуковы кіраўнік канд. гіст. навук, Масейчук Л. І.***

*Кафедра філасофіі і паліталогіі*

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, г. Мінск*

# МЭТЫ І ГАЛОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ:

- Расказаць, як на адным узроўне са зброяй акупанты паспрабавалі выкарыстоўваць веру людзей супраць іх саміх.
- Паказаць, што на самой справе адбывалася на акупаванай зямле
- Выкарыстоўваючы афцыйныя дакументы, падцвердзіць нязбытныя абяцанні захопнкаў

Галоўнымі мэтамі нямецкай улады з’яўляліся поўнае падпарадкаванне і эксплутаванне насельніцтва акупаванных тэрыторый. Абок з рэпрэсіўнымі захадамі, такімі як прымус да працы, расстрэл, тэррор і забойствы актыўна выкарыстоўвалась прапаганда. Фарміраванню ў вачах мірнага населніцтва вобраза нямецкага салдата як збавіцеля актыўна садзейнічалі нямецкія прапагандысты, падрыхтоўка якіх вялася пад наглядам Вермахта.












“Усякая прапаганда, - павінна быць даступнай для масы; яе ўзровень павінен зыходзіць з меры разумення, уласцівы самым адсталым індывідам з ліку тых, на каго яна хоча ўздзейнічаць <...>. Паколькі справа ідзе пра прапаганду ў час вайны <...> то ясна, што прапаганда павінна быць максімальна простая.”

А. Гітлер

Асаблівую ўвагу нямецкія прапагандысты надавалі такой сацыяльнай группе як рабочыя і сяляне. У прапагандыскіх лістоўках да насельніцтва гаварылася: “Германія не патрабуе ад беларусаў цела і жыцця, Германіі патрэбны рабочыя! Прамысловыя, сельскагаспадарчыя, рамеснікі, аднак і неадукаваныя рабочыя знойдуць у Германіі лепшыя ўмовы працы і харчавання, чым дома.”













“Сяляне Беларусі! Ніхто не павінен казаць, што ў час барацьбы за вызваленне сярод вас былі лянівыя і маладушныя баязліўцы. Вы ведаеце, што нямецкі народ адзін нясе вялікі груз, ахвяры гэтай вайны, для абароны і вызвалення Еўропы. Нямецкія сяляне і рабочыя на фронце, яны абараняюць ваша жыццё і вашу краіну. Ваш абавязак — заняць асірацелае працоўнае месца за плугам ці за станком, таму запісвайцеся на працу ў Германію!”

# “ДЗЕЛЯ СВАБОДНАЙ І ШЧАСЛІВАЙ БЕЛАРУСІ”














# “ДЗЕЛЯ СВАБОДНАЙ І ШЧАСЛІВАЙ БЕЛАРУСІ”








У імкненні раз’яднаць насельніцтва Беларусі на як мага большую колькасць частак, прапаганда ўсё больш падкрэслівала на захопленых тэрыторыях нацыянальныя адметнасці. У гэтым накірунку адным з асноўных пунктаў нямецкай прапаганды з’яўлялся антысемітызм.















Існавала яшчэ адзін напрамак нямецкай прапаганды, які быў шырока распаўсюджаны на беларускіх тэрыторыях падчас Вялікай Айчыннай вайны – антыкамуністычная прапаганда.

Такая прапаганда замацоўвалась жорсткай заканадаўчай базай. Так паводле адміністрацыйнага распараджэння № 9 (Адміністрацыйнае распараджэнне камандуючага вобласці тыла аб карных мерапрыемствах супраць цывільнага насельніцтва , ад 21 кастрычніка 1941), кожны, хто выключыць сябе з барацьбы супраць бальшавізму, будзе разглядацца як паплечнік бальшавізму, і з ім будуць паступаць належным чыным. Пры гэтым шырока выкарыстоўваліся метады неабмежаванага тэрору, фізічнага знішчэння насельніцтва, захопнікі стварылі цэлую сістэму масавага знішчэння савецкіх людзей у шматлікіх турмах, канцэнтрацыйных лагерах і лагерах смерці.






Нягледзячы на масавы тэрор, барацьба партызан карысталася значнай папулярнасцю і падтрымлівалася большасцю насельніцтва. Таму раводзілася сур'ёзная праца па папярэджанні падтрымкі партызанскага руху. Немцкія ідэолагі актыўна распачалі новы накірунак прапагандысцкай вайны. У сваіх закліках да насельніцтва ўзводзілі паклёп на партызан, якіх яны называлі не інакш як бандытамі, а партызанскі рух вызначалі як “бандытызм”.









# ВЫВЫДЫ:

Такім чынам, можна зразумець, што, негледзячы на старанні захопнікаў, у іх усё ж такі не атрымалася пераламіць людзей. У кожным з напрамкаў прапаганды былі свае недахопы, але ж галоўным было тое, што ў рэчатснасці нямецкая ўлада выкарыстала жорсткія, бязлітасныя і нечалавечныя метады для падпарадкавання людзей.

- Дзякуй за ўвагу!